# БЫЦЬ ПЕРШАКЛАСНІКАМ — ЗАДАЧКА НЕ З ЛЁГКІХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Найбольш напружаныя для ўсіх дзяцей — першыя чатыры тыдні навучання. У гэты час вельмі важная ўвага і падтрымка з боку бацькоў і настаўнікаў. Вялікае значэнне мае мікраклімат у сям'і. У выпадку ўзнікнення складанай школьнай сітуацыі бацькі могуць выказваць сваё меркаванне на праблему, але дзіця павінна адчуваць іх падтрымку. Паспяховасць у вучобе — не галоўнае, асабліва калі яна негатыўна адбіваецца на эмацыянальным і фізічным стане дзіцяці. Вельмі важна на першых кроках школьнага жыцця не крытыкаваць дзіця, не параўноўваць яго з іншымі, а прымусіць яго паверыць у поспех. Празмерная жорсткасць, раздражняльнасць і нецярплівасць з боку бацькоў сітуацыю толькі пагоршаць.

Псіхолагі лічаць, што шасцігодкі належаць больш усё ж такі дашкольнаму свету, чым школе: сапраўды, яны здольныя засвойваць вучэбны матэрыял, але толькі ў выглядзе гульні, а з гэтай задачай, як сведчыць практыка, спраўляюцца не ўсе педагогі.

Назіранні паказалі, што сацыяльна-псіхалагічная адаптацыя можа праходзіць па-рознаму. Значная частка дзяцей (прыкладна 50-60%) прывыкаюць на працягу 2-3 месяцаў навучання. Гэта праяўляецца ў тым, што дзіця ўліваецца ў новы калектыў, бліжэй знаёміцца са сваімі аднакласнікамі, набывае сяброў. У такіх дзяцей пераважае добры настрой, актыўнае стаўленне да вучобы, жаданне наведваць школу, здольнасць добрасумленна і без прыкметнага напружання выконваць патрабаванні настаўніка.

Іншым дзецям (каля 30%) патрабуецца больш часу для прывыкання да новага школьнага жыцця. Яны не адразу выконваюць патрабаванні настаўніка, часта высвятляюць адносіны з аднагодкамі неадэкватнымі метадамі (б'юцца, капрызяць, плачуць, скардзяцца). У гэтых дзяцей узнікаюць цяжкасці і ў засваенні школьных праграм.

І, нарэшце, у кожным класе ёсць прыкладна 14% дзяцей, у якіх да цяжкасцяў у вучобе дадаюцца цяжкасці працяглай (да аднаго года) адаптацыі. Такіх дзяцей вылучаюць устойлівыя адмоўныя эмоцыі, нежаданне вучыцца і наведваць школу. Часта менавіта з гэтымі дзецьмі не жадаюць сябраваць і супрацоўнічаць аднакласнікі, што выклікае новую рэакцыю пратэсту: яны паводзяць сябе задзірліва, перашкаджаюць праводзіць навучальныя заняткі і г.д.

Адна з галоўных прыкмет паспяховай адаптацыі дзіцяці да школьнага жыцця — гэта ступень самастойнасці пры выкананні ім вучэбных заданняў, жаданне звярнуцца па дапамогу да дарослых толькі пасля спроб самастойна справіцца з задачай. Бацькі нярэдка вельмі старанна дапамагаюць дзіцяці, што выклікае адмоўны эфект — вучань прывыкае да сумеснай падрыхтоўкі ўрокаў і не жадае рабіць іх адзін. Таму лепш адразу акрэсліць межы бацькоўскай дапамогі і паступова змяншаць яе аб'ёмы. Нельга парушаць адзін з важных прынцыпаў выхавання — не рабіць за дзяцей тое, што яны ў стане зрабіць самі.

Яшчэ адна найважнейшая ўмова паспяховай адаптацыі да школы — фарміраванне ўмення правільна ацэньваць свае дзеянні і дзеянні аднакласнікаў, карыстацца найпрасцейшымі крытэрыямі ацэнкі і самаацэнкі.

Бацькам варта памятаць, што з паступленнем у школу ў жыцці дзіцяці з'явіўся чалавек больш аўтарытэтны, чым яны. Гэта настаўнік. Абавязкова трэба паважаць меркаванне дзіцяці пра свайго педагога.

А самай красамоўнай прыкметай таго, што дзіця асвоілася ў новым асяроддзі, можна лічыць яго задавальненне ад зносін з аднакласнікамі і настаўнікам. Калі дзіцяці цікава ў новым калектыве і яно не адчувае няўпэўненасці ў сабе — значыць, бацькі могуць спаць спакойна...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### Прыкладны спіс неабходных прылад для першага класа ў школах:

— школьны ранец, партфель ці заплечнік,
— набор каляровых ручак,
— фламастар і алоўкі,
— гумка,
— вастрылка,
— вокладкі для сшыткаў і кніг,
— пенал,
— лінейка,
— фарбы (акварэльныя або гуаш),
— альбом для малявання,
— набор пэндзлікаў.

### Пытанні, якія часцей за ўсё задаюць прадстаўнікам Міністэрства адукацыі бацькі:

***Якія дакументы неабходныя пры паступленні дзіцяці ў першы клас?***

Заява на імя кіраўніка ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі;

медыцынская даведка аб стане здароўя дзіцяці;

пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці.

Дакументы ад бацькоў прымаюцца па 28 жніўня.

Прысутнасць дзіцяці пры падачы дакументаў у школу неабавязковая

***Ці правамоцна праводзіць у школах тэсціраванне дзяцей, якія паступаюць у першы клас?***

Прыём дзяцей ва ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца без уступных выпрабаванняў.

***На чым бацькам спыніць свой выбар: на школе, пра якую «ходзіць» добрая слава, ці лепш шукаць добрага настаўніка?***

Шукайце добрага, цярплівага педагога, які любіць дзяцей і сваю работу. Ад яго будзе залежаць усё: і жаданне вучняў кожны дзень «бегчы» ў школу, чакаючы сустрэчы са сваёй самай добрай настаўніцай, і засваенне новага матэрыялу на ўроку, і добры настрой бацькоў.

***Як ацэньваюцца вынікі навучання першакласнікаў?***

У класе, дзе навучаюцца шасцігадовыя дзеці, выключаецца сістэма бальнага (адзнакавага) ацэньвання. **Недапушчальна таксама выкарыстанне любой знакавай сімволікі, якая замяняе лічбавую адзнаку (зорачак, сонейкаў, кветачак і г.д.).** Дапускаецца толькі слоўнае ацэньванне. Акрамя таго, нельга пры няправільным адказе вучня казаць «не стараўся», «не думаў», «няправільна». Ніякаму ацэньванню не падлягаюць тэмп работы вучня, асабістыя якасці школьнікаў, своеасаблівасць іх псіхічных працэсаў (асаблівасці памяці, увагі, успрымання, тэмп дзейнасці і інш.).

На працягу першага года навучання кантрольныя работы не праводзяцца. Выніковыя кантрольныя работы праводзяцца толькі ў канцы навучальнага года. Настаўнікам забаронена правяраць тэхніку чытання «на хуткасць» з секундамерам.

Адукацыйны працэс у першым класе ашчадны: урокі праводзяцца толькі ў першую змену. У класах павінна быць не больш за 20 чалавек.

Навучальныя заняткі доўжацца 35 хвілін, на працягу якіх праводзяць дзве фізкультхвілінкі па 1,5-2 хвіліны кожная. Перапынкі паміж урокамі не менш за 10 хвілін, пасля другога ці трэцяга ўрока — абавязковая паўгадзінная прагулка на свежым паветры. Хатнія заданні першакласнікам не задаюцца. Падручнікі і дыдактычныя дапаможнікі рэкамендуецца захоўваць у школе.

У сярэдзіне трэцяй, самай працяглай, чвэрці для вучняў першых класаў арганізуюцца дадатковыя тыднёвыя канікулы.

## Колькасць дзесяцікласнікаў у сталіцы павялічыцца

**Урачыстыя лінейкі, прысвечаныя пачатку новага навучальнага года, пройдуць у Мінску ў апошні дзень лета — 31 жніўня.**

У 2016/2017 навучальным годзе у сталіцы будзе функцыянаваць 241 установа агульнай сярэдняй адукацыі: 50 гімназій, 1 гімназія-каледж, 2 ліцэі, 176 сярэдніх школ, 1 кадэцкае вучылішча, 5 пачатковых школ, 5 пачатковых школ-садзікаў і 1 санаторная школа-інтэрнат.

Па папярэдніх звестках, у сталічных установах агульнай сярэдняй адукацыі будуць навучацца 185,5 тысячы чалавек. У параўнанні з папярэднім навучальным годам колькасць вучняў павялічыцца больш чым на 8 тысяч. Усяго плануецца адкрыць больш як 800 першых класаў: за парты ўпершыню сядуць больш за 23 тысячы хлопчыкаў і дзяўчынак. Таксама ва ўстановах адукацыі ўжо сфарміраваны 425 дзясятых класаў з агульнай колькасцю навучэнцаў 10,5 тысячы (у 2015/2016 навучальным годзе налічвалася 9,5 тысячы дзесяцікласнікаў).

Увод у эксплуатацыю новых школ у сталіцы ў 2016 годзе не запланаваны. Затое запланаваны капітальны рамонт 12 будынкаў агульнай сярэдняй адукацыі (у 8 з іх — комплексны капрамонт). Што датычыць бягучага рамонту, то ўжо прыведзены ў парадак дахавыя пакрыцці агульнай плошчай 4,9 тысячы квадратных метраў, 19 санвузлоў і 5 харчовых блокаў. Адрамантаваныя фасады будынкаў 8 устаноў адукацыі. Добраўпарадкавана тэрыторыя 7 школ. Гатоўнасць вучэбных класаў і кабінетаў да новага навучальнага года складае ў сталіцы 95 працэнтаў.

## Канікулы і адпачынак — па графіку

**Прадстаўнікі Міністэрства адукацыі расказалі, як будуць адпачываць школьнікі ў 2016/2017 навучальным годзе, каб бацькі маглі загадзя спланаваць іх канікулярны час.**

Так, першая вучэбная чвэрць будзе доўжыцца ў беларускіх школах з 1 верасня па 29 кастрычніка. Другая — з 8 лістапада па 24 снежня. Трэцяя — з 9 студзеня па 25 сакавіка і чацвёртая — з 3 красавіка па 31 мая.

Такім чынам, працягласць асенніх канікулаў складзе 9 дзён (з 30 кастрычніка па 7 лістапада ўключна). Зімой школьнікі будуць адпачываць 15 дзён (з 25 снежня 2016 года па 8 студзеня 2017 года) і вясной — 8 дзён (з 26 сакавіка па 2 красавіка).

Для навучэнцаў першых і другіх класаў у трэцяй вучэбнай чвэрці прадугледжаны дадатковыя зімовыя канікулы (з 13 па 19 лютага 2017 года) агульнай працягласцю 7 дзён. Летнія канікулы стартуюць для беларускіх школьнікаў 1 чэрвеня. Апошні дзень адпачынку — 31 жніўня.

Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ Прыёмная кампанія—2016

# У БДЭУ ЛІДЗІРУЕ МІЖНАРОДНЫ НАПРАМАК

**63% абітурыентаў, залічаных у Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт на дзённую бюджэтную форму навучання, мелі ў сваім багажы больш за 300 балаў (тры сертыфікаты плюс атэстат). У БДЭУ падвялі вынікі прыёмнай кампаніі.**

За бюджэтныя месцы ў гэтым годзе змагаліся 2605 чалавек і 2340 — за платныя. Першакурснікамі сталі 3469 чалавек. Сярэдні конкурс па ўніверсітэце на бюджэт склаў 1,7 чалавека на месца. Сярод усіх залічаных на дзённую форму навучання 355 чалавек з'яўляюцца медалістамі і выпускнікамі, якія скончылі ССНУ з адзнакай, і трое — пераможцамі міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд і конкурсаў.

Самыя высокія прахадныя балы на дзённай бюджэтнай форме навучання былі зафіксаваныя на спецыяльнасцях «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі» (факультэт міжнародных бізнес-камунікацый) — 357 балаў, «Бізнес-адміністраванне» (факультэт міжнародных эканамічных адносінаў) — 354 балы і «Сусветная эканоміка» (факультэт міжнародных эканамічных адносінаў) — 339 балаў.

Каго ж рыхтуюць на самых запатрабаваных у моладзі спецыяльнасцях? Як патлумачылі ў прэс-службе ўніверсітэта, студэнты спецыяльнасці «Лінгвістычнае забеспячэнне міжкультурнай камунікацыі» акрамя эканамічных дысцыплін і дзвюх замежных моў вывучаюць асаблівасці дзейнасці экспартна арыентаваных прадпрыемстваў, вучацца псіхалогіі дзелавых адносінаў, дзелавой культуры ў міжнародным бізнесе, стратэгіям камунікатыўных паводзінаў. На спецыяльнасці «Бізнес-адміністраванне» вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў для працы на прадпрыемствах і ў арганізацыях, якія ажыццяўляюць гаспадарчую дзейнасць як на нацыянальным, так і міжнародным рынках. Студэнты вывучаюць розныя аспекты нацыянальнай і міжнароднай эканомікі, авалодваюць тэхнікай кіравання бізнесам, плюс дзвюма замежнымі мовамі. Выпускнікі спецыяльнасці «Сусветная эканоміка» працуюць у экспартных і маркетынгавых службах фірмаў, у беларускіх замежных дыпламатычных місіях, валютна-фінансавых упраўленнях найбуйнейшых банкаў, на сумесных прадпрыемствах, у прадстаўніцтвах замежных фірмаў і міжнародных арганізацый. Як бачна, усе спецыяльнасці, якія ўваходзяць у Эканамічным універсітэце ў ТОП-3, даюць моладзі магчымасць працаваць на міжнародных напрамках.



На платнай форме навучання па прахадных балах у БДЭУ лідзіруюць спецыяльнасці «Правазнаўства» (факультэт права) — 287 балаў, «Бізнес-адміністраванне» (факультэт міжнародных эканамічных адносінаў) — 260 балаў і «Лагістыка» (факультэт маркетынгу і лагістыкі) — 238 балаў.

На завочнай бюджэтнай форме навучання (скарочаны тэрмін) самыя высокія прахадныя балы на спецыяльнасцях «Бізнес-адміністраванне» — 277, «Правазнаўства» — 271 і «Лагістыка» — 263. А для тых, хто атрымлівае адукацыю на ўмовах аплаты, «Правазнаўства» — 231, «Лагістыка» — 221 і «Менеджмент» — 215.